**ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА**
**«СЛУЦКАЯ РАЁННАЯ ЦЭНТРАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА»**
**АДДЗЕЛ АБСЛУГОЎВАННЯ І ІНФАРМАЦЫІ**
**СЕКТАР ІНФАРМАЦЫЙНА-БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ РАБОТЫ**

# ПАМЯТНЫЯ ДАТЫ КАЛЕНДАРА, 2026
# г. Слуцк, Слуцкі раён

**Слуцк, 2025**

*Зямля мая, пад небам сінявокім*
*Красуешся і вабіш чысцінёй.*
*Чаруюць лёгкакрылыя аблокі…*
*Маё натхненне ты і гонар мой.*
*О, як багата колераў і красак –*
*І акрыляе думак маладосць.*
*Душы маёй і сэрца абавязак*
*Любіць і славіць гэту прыгажосць.*

*Ганна Міклашэвіч*

Слуцк — горад з багатай гісторыяй, яркай культурай і асаблівай атмасферай. Веліч і славу горада стваралі многія пакаленні случчан, людзі розных прызванняў і прафесій. Многія з іх з’яўляюцца юбілярамі 2026 года. Юбілейным будзе гэты год і для шэрага арганізацый, устаноў і прадпрыемстваў Случчыны.

Спіс уключае пералік дат, якія адлюстроўваюць асноўныя падзеі і факты з жыцця краю, юбілейныя даты дзеячаў, месца нараджэння, жыццё ці дзейнасць якіх звязаны з краем. Даты жыцця асоб даюцца ў новым каляндарным стылі, пасля даты нараджэння ўказваецца месца нараджэння. Спіс прызначаны ў дапамогу арганізацыі краязнаўчай работы, бібліятэкарам, работнікам музеяў, а таксама ўсім, хто цікавіцца мінулым і сучасным Слуцкага краю.

Пачынаецца спіс з інфармацыі ў храналагічнай паслядоўнасці аб падзеях. Далей прадстаўлена інфармацыя аб персаналіях таксама ў храналагічнай паслядоўнасці.

Асновай для стварэння спіса «Памятныя даты календара 2025, г. Слуцк, Слуцкі раен» з’яўляюцца звесткі з наступных выданняў:

**Архітэктура Беларусі** : энцыкл. даведнік / рэдкал. : А. А.Воінаў [і інш.]. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 1993. – 620 с.

**Асветнікі зямлі Беларускай**, X – пачатак XX ст. : энцыкл. даведнік / [рэдкал. : Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш.]. – 2-е выд. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2006. – 492 с. : фат., іл.

**Беларуская мова** : энцыклапедыя / Беларуская Энцыклапедыя ; пад рэд. А. Я. Міхневіча. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 1994. – 654 с. : фат., іл.

**Беларуская энцыклапедыя** : у 18 т. / Беларуская Энцыклапедыя ; рэдкал. : Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 1996–2004. – 18 т.

**Беларускі фальклор** : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал. : Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2005–2006. – 2 т.

**Беларускія пісьменнікі** : біябібліягр. слоўнік : у 6 т. / Ін-т імя Я. Купалы АН Рэспублікі Беларусь, Беларуская энцыклапедыя; рэдкал. : А. В. Мальдзіс [і інш.]. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 1992–1995. – 6 т.

**Беларусь** : энцыкл. даведнік / Беларуская Энцыклапедыя ; рэдкал. : Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.] ; маст. М. В. Драко, А. М. Хількевіч. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 1995. – 799 с. : фат., іл.

**Видлога, В. С. Слуцк : по старым адресам** / В. С. Видлога ; Государственное учреждение "Слуцкий краеведческий музей". – Минск : Беларуская навука, 2019. – 196, [2] с.

**Волкаў, М. А. Замкі і фартэцыі Радзівілаў на беларускіх землях у XVI — пачатку XVIII ст.** / Мікола Волкаў ; Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут гісторыі. – 2-е выд. – Мінск : Беларуская навука, 2021. – 214, [1] с.

**Волкаў, М. А. Слуцк на старых планах** / Мікалай Волкаў ; навук. рэд. Д. В. Лісейчыкаў. – Мінск : Беларусь, 2017. – 159 с.

**Вялікае княства Літоўскае :** энцыклапедыя : у 2 т. /рэдкал. : Г. П. Пашкоў (гал.рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 2006. – 2 т.

**Жук, А. У. Слуцкая літаратурная даўніна : імёны, творы, кнігі** / Анатоль Жук. – Мінск : Колорград, 2025. – 255 с., [6] л. іл., партр., факсім.

**Марціновіч, А. Случчына. Старонка міла і багата** / Алесь Марціновіч. - Мінск : Беларусь, 2019. – 159 с. – (Падарожжа па родным краі).

**Минская область** : энциклопедия : в 2 т. / редкол. : Л. Ф. Крупец, Г. П. Пашков [и др.]. – Минск : Беларуская Энцыклапедыя, 2007. - 2 т.

**Памяць :** гіст.-дакум. хроніка Слуцкага р-на і г.Слуцка : у 3 кн. – Мінск : БЕЛТА, 2000–2015. – 3 т.

**Регионы Беларуси** : энциклопедия : в 7 т. / редкол. : В. В. Андриевич (гл. ред.) [и др.]. - Минск : Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2016–2017. – 7 т.

**Республика Беларусь** : энциклопедия: в 6 т. / редкол. : Г. П. Пашков (гл.ред.) [и др.] – Минск : Беларуская энцыклапедыя, 2005–2008. – 6 т.

**Родчанка, Р. В. Случчыне** : выбраныя творы / Рыгор Родчанка ; укладанне, каментарыі А. У. Жука. – Мінск : Колорград, 2025. – 566, [1] с., [6] л. іл.

**Рэлігія і царква на Беларусі** : энцыкл. даведнік / [рэдкал. : Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; маст. А. А. Глекаў]. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2001. –366 с. : фат., іл.

**Случтина. История и современность** / Слуцкий районный исполнительный комитет. – Минск : БЕЛТА, 2011. – 96 с.

**Случчына: ілюстраваны летапіс краю** / гал. рэд. Г. М. Галаватая ; рэд. А. В. Жыбуль. – Мінск : БЕЛТА, 2016. – 200 с.

**Случчына. Памнажаем створанае** = Слутчина. Умножаем созданное = Slutsk region. Increasing the previous achievements / [аўтар тэксту З. Д. Шклянік ; рэдкалегія: У. Л. Гога і інш. ; фота: В. В. Ражкоў]. – Мінск : Колорград, 2022. – 97, [2] с.

**Спортивная энциклопедия Беларуси** / редкол. : Г. П. Пашков (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Беларуская Энцыклапедыя, 2005. – 503 с. : фот.

**Ціткоўскі, І. А. Мастацтва Случчыны : гісторыя, імёны, творы** / Ігар Ціткоўскі. – Мінск : Тэхналогія, 2019. – 211 с.

**Ціткоўскі, І. А. Слуцк. Гісторыя горада ў помніках архітэктуры** / Ігар Ціткоўскі. – Мінск : Смэлтак, 2015. – 318 с.

**Энцыклапедыя гісторыі Беларусі** : у 6 т. / Беларуская Энцыклапедыя ; рэдкал. : Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 1993–2003. – 6 т.

**Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі** : у 5 т. / рэдкал. : І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская Савецкая Энцыклапедыя, 1984–1987. – 5 т.

**Этнаграфія Беларусі** : энцыклапедыя / Беларуская Савецкая Энцыклапедыя ; рэдкал. : І. П. Шамякін (гал.рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская Савецкая Энцыклапедыя, 1989. – 575 с. : фат., іл.

# Слуцк:
# падзеі і час



**910** гадоў з часу ўпамінання г.Слуцка ў «Аповесці мінулых гадоў» як горада Тураўскай зямлі (1116г.).

**585** гадоў з часу атрымання Слуцкам граматы на Магдэбургскае права (1441г.).

**440** гадоў назад пачало сваю дзейнасць у Слуцку Прэабражэнскае праваслаўнае царкоўнае брацтва (1586г.)

**405** гадоў з часу першых звестак пра аптэку ў Слуцку (1621г.).

**365** гадоў з пачатку дзейнасці ў Слуцку манастыра бернардзінцаў (1661 – 1832гг.).

**320** гадоў назад гарады **Слуцк** і Нясвіж былі ўзяты шведскімі войскамі падчас Паўночнай вайны (1706г.).

**280** гадоў назад створана слуцкая капэла музыкантаў (прыдворны аркестр князя Гераніма Фларыяна Радзівіла) (1746г.).

**275** гадоў назад пры двары слуцкага князя Радзівіла створаны прафесійны тэатр (1751-1760гг.), адзін з першых тэатраў Беларусі.

**270** гадоў назад пры тэатры Радзівіла адкрылася балетная школа (1756г.).

**250** гадоў назад Слуцк быў пазбаўлены Магдэбургскага права (1776г.).

**235** гадоў назад Слуцкае княства было скасавана. Слуцк стаў цэнтрам Случарэцкага павета Навагрудскага ваяводства (1791).

**230** гадоў назад Мінскае намесніцтва было перайменавана ў губернію, а з 13 уездаў створаны 10 паветаў: Мінскі, Ігуменскі, Бабруйскі, Рэчыцкі, Мазырскі, Пінскі, **Слуцкі,** Вілейскі, Дзісненскі, Барысаўскі (1796г.).

**180** гадоў назад у Слуцку пабудавана першая паштовая станцыя (1846).

**180** гадоў назад закончана будаўніцтва Маскоўска-Варшаўскай шашы, якая пралягла праз Слуцк (1846г.).

**130** гадоў назад у Вільні выйшла з друку кніга Ф.Ф. Серна-Салаўевіча «Древнерусский город Слуцк и его святыни» (1896г.).

**130** гадоў назад пачата будаўніцтва чыгуначнай лініі Асіповічы – Слуцк (1896).

**130** гадоў назад у Слуцку пачаў працаваць фотасалон віцебскага мешчаніна Саміра Юхніна (1896).

**120** гадоў з часу фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі А. К. Сержпутоўскага ў Слуцкі і Мазырскі паветы (1906г.).

**115** у в. Покрашава пабудаваны спіртзавод (1911).

**105** гадоў назад ў в. Пуцяты арганізавана першая ў Слуцкім павеце сельскагаспадарчая камуна імя К. Маркса, рэарганізаваная ў 1925 г. у аднайменны калгас (красавік 1921).

**105** гадоў назад пачала выходзіць газета «Плуг і молат» (лістапад 1921г. – студзень 1922), якая раней мела назву «Молат і плуг».

**100** гадоў назад выйшаў з друку паэтычны зборнік «Слуцкія песняры» членаў Слуцкай філіі літаратурнага аб’яднання «Маладняк» (1926г.).

**90** гадоў назад ў Слуцку пачаў працаваць прафесійны калгасна-саўгасны тэатр (1936–1941гг.).

**90** гадоў назад створана Слуцкая лясная гаспадарка (ліпень1936г.).

**85** гадоў з пачатку акупацыі Случчыны нямецка-фашысцкімі захопнікамі (27 чэрвеня 1941г.).

**80** гадоў назад пачаў працаваць радыёвузел (1946г.).

**80** гадоў назад першых навучэнцаў прыняла вячэрняя (зменная) сярэдняя школа №1 (1946г.).

**70** гадоў назад першых вучняў прыняла сярэдняя школа № 3 (1956г.).

**70** гадоў назад у склад Слуцкага раёна ўвайшлі Грэскі, Першамайскі, Мусіцкі, Труханавіцкі сельсаветы былога Грэскага раёна (1956).

**65** гадоў назад першую прадукцыю выпусціў льнозавод (1961г.) (цяпер – ААТ «Слуцкі льнозавод»).

**65** гадоў назад створана будаўніча – мантажнае ўпраўленне у вёсцы Грэск (1961г.) (цяпер – ААТ «ПМК – 71»).

**60** гадоў назад Слуцк быў узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР (1966г.).

**60** гадоў назад ўведзена званне «Ганаровы грамадзянін горада Слуцка» (1966г.).

**60** гадоў назад першых вучняў прыняла сярэдняя школа № 6 (1966г.) (цяпер – Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Сярэдняя школа № 6 г. Слуцка»).

**55** гадоў назад у в. Грэск адкрылася першая ў раёне дзіцячая музычная школа (1971 г.) (цяпер – ДУА «Грэская дзіцячая школа мастацтваў»).

**55** гадоў назад першую прадукцыю выпусціў Слуцкі піваварны завод (1971г.).

**45** гадоў назад на рацэ Случ каля вёскі Рудня пабудавана вадасховішча (1981 г.).

**40** гадоў назад пачаў дзейнічаць фізкультурна-аздараўленчы комплекс «Дэльфін» (1986) (цяпер – спартыўны комплекс «Дэльфін»).

**35** гадоў назад пабудаваны гандлёвы цэнтр «Слуцк» (1991) (цяпер – КУП «Універмаг “Слуцк”».

**35** гадоў назад у в. Гацук адкрыта дзіцячая музычная школа (1991г.) (цяпер – Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Гацукоўская дзіцячая школа мастацтваў»).

**30** гадоў з часу адкрыцця гарадскога Дома культуры моладзі на вуліцы Галавашчанкі ў Слуцку (18 жніўня 1996 г.) (цяпер – Цэнтр культуры і вольнага часу ДУК «Слуцкі гарадскі Дом культуры»).

**30** гадоў назад у Слуцку адкрыты помнік воінам, якія загінулі ў Афганістане (18 кастрычніка 1996 г.).

**25** гадоў з часу выхаду з друку другога тома кнігі «Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Слуцкага раёна і г. Слуцка» (красавік 2001 г.).

**25** гадоў з часу адкрыцця філіяла «Побыт і заняткі сялян Слуцкага павета XIX – пачатку XX стагоддзяў» (2001г.), які ў 2006 годзе перайменаваны ў філіял «Музей этнаграфіі» дзяржаўнай ўстановы «Слуцкі краязнаўчы музей»

**20** гадоў з часу выхаду з друку фотаальбома «В граде Слуцке. Слуцкие пояса» (2006 г.).

**15** гадоў з часу першага выпуска тэлепраграмы «Слуцк TV» (1 ліпеня 2011 г.).

**15** гадоў з часу выхаду з друку фотаальбома «Слуцк. Падарожжа ў часе» – сумеснага творчага праекта Слуцкага краязнаўчага музея, ААТ

«Слуцкі цукроварафінадны камбінат» і выдавецтва «Літаратура і Мастацтва» (верасень 2011г.).

**15** гадоў назад у Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэцы адбылася прэзентацыя факсімільнага выдання Слуцкага Евангелля (2011).

**10** гадоў назад у Слуцку быў устаноўлены помнік княгіне Анастасіі Слуцкай, якая ў пачатку 16 ст. узначаліла абарону г. Слуцка ад татарскага нашэсця (13 верасня 2016 г.). Аўтар помніка – скульптар С. Л. Аганаў.

**10** гадоў назад на вуліцы Магістральнай у Слуцку быў асвечаны паклонны крыж храма Паісія Святагорца (12 ліпеня 2016).

# Асобы ў гісторыі краю



**545** гадоў з пачатку княжання ў Слуцку **Сямёна II Міхайлавіча Алелькавіча** (1460–1505), гады княжання: 1481–1505гг.

**495** гадоў з дня нараджэння **Алелькавіча Юрыя** (каля 1531 – 9.11.1578), князя слуцкага, дзяржаўнага і ваеннага дзеяча ВКЛ, удзельніка Лівонскай вайны 1558–1583 гг., мецэната.

**450** гадоў з пачатку дзейнасці ў Слуцку храніста, гісторыка, паэта, філосафа, дзеяча беларускага Адраджэння **Мацея Стрыйкоўскага** (21.03.1547 – 1593), аўтара самага значнага з яго твораў «Хронікі польскай, літоўскай, жамойцкай і ўсёй Русі», напісанай ў Слуцку пры двары князя Юрыя II Юр'евіча Алелькавіча ў 1576 – 1578г.

**375** гадоў з дня нараджэня **Капіевіча (Капіеўскі) Іллі Федаравіча** (1651 – 1714), асветніка, перакладчыка, кнігавыдаўца, літаратара, паслядоўніка Ф. Скарыны, які адзін з першых распрацаваў для ўсходніх славян навуковую тэрміналогію па многіх галінах ведаў. Вучыўся ў Слуцкай кальвінісцкай гімназіі, дзе атрымаў пасаду лектара.

**130** гадоў з дня нараджэння **Кіш Алены Андрэеўны** (1896, па іншых крыніцах 1889, м. Раманава (цяпер аг. Леніна – 1949), майстра дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, аўтара самаробных дываноў.

**130** гадоў з дня нараджэння **Міхаіла Іосіфавіча Караля** (1896, в. Лядна – 1970), кандыдата гістарычных навук, удзельніка Першай сусветнай, Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў.

**100** гадоў з дня нараджэння **Крапчана Барыса Шоламавіча** (1926, г. Слуцк – 1996), паэта.

## Студзень

**100** гадоў з дня нараджэння **Шубы Паўла Паўлавіча** (**15.01**.1926, в. Танежыцы – 4.09.2000), мовазнаўца, доктара філалагічных навук, акадэміка Беларускай акадэміі адукацыі, заслужанага дзеяча навукі Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1998г), удзельніка Вялікай Айчыннай вайны.

**65** гадоў з дня нараджэння **Станкевіча Сяргея Леанідавіча** (**17.01**.1961, г. Слуцк), танцоўшчыка, заслужанага артыста Беларусі.

**135** гадоў з дня нараджэння **Бранявіцкага Пятра Сямёнавіча** (**28.01**.1891, г. Слуцк – 4.04.1949), генерал-маёра, удзельніка грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў.

## Люты

**95** гадоў з дня нараджэння **Пратасені Івана Міхайлавіча** (**1.02**.1931, в. Знамя – 22.03.2022), мастака, майстра акварэлі і кніжнай графікі, мастака Дзяржтэлерадыё БССР, мастацкага рэдактара выдавецтваў «Ураджай», «Беларуская

Савецкая Энцыклапедыя», часопіса «Работніца і сялянка».

**95** гадоў з дня нараджэння **Русака Васіля Паўлавіча** (**1.02**.1931, в. Ячава – 25.09.1987), генерал-маёра, намесніка старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі БССР.

**105** гадоў з дня нараджэння **Корбута Віктара Пятровіча** (**13.02**.1921, в. Квасынічы – 24.07.1996), удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, падпалкоўніка, начальніка кафедры Вышэйшага ваеннага аўтамабільнага вучылішча ў Чалябінску.

## Сакавік

**70** гадоў з дня нараджэння **Лістапада Мікалая Ізмаілавіча** (**3.03**.1956, в. Захараўка), беларускага вучонага ў галіне тэлекамунікацыйных сістэм і камп'ютарных сетак, доктара тэхнічных навук.

**80** гадоў з дня нараджэння **Скварцовай Тамары Уладзіміраўны** (**9.03.**1946, в. Бялевічы), актрысы, заслужанай артысткі Рэспублікі Беларусь.

**105** гадоў з дня нараджэння **Барысаўца Канстанціна Федаравіча** (**11.03**.1921, в. Знамя – 2011), беларускага вучонага ў галіне жывёлагадоўлі, доктара эканамічных навук, прафесара, заслужанага работніка сельскай гаспадаркі Беларусі.

**95** гадоў з дня нараджэння **Міська Паўла Андрэевіча** (**14.03**.1931, в. Старцавічы (цяпер – в. Знамя) – 9.06.2011), беларускага пісьменніка, перакладчыка, драматурга.

**120** гадоў з дня нараджэння **Торыка Мікалая Антонавіча** (**15.03**.1906, в. Перавоз, Слуцкі павет (цяпер Капыльскі р-н) – 15.04.1999), ваеннага дзеяча, генерал-маёра берагавой службы, віцэ-адмірала, удзельніка савецка-фінляндскай вайны 1939-1940 гг., Вялікай Айчыннай вайны, кавалера ордэна Леніна, ганаровага грамадзяніна горада Слуцка.

**205** гадоў з дня нараджэння **Красоўскага Антона Якаўлевіча** (**18.03**.1821, г. Слуцк – 25.04.1898), педагога, урача, аднаго з заснавальнікаў аперацыйнага акушэрства і гінекалогіі ў Расіі.

**90** гадоў з дня нараджэння **Башуры Генадзя Сцяпанавіча** (**29.03**.1936, в. Некрашы), вучонага, фармаколага, доктара фармакалагічных навук, прафесара, заслужанага дзеяча навукі і тэхнікі Украіны.

**220** гадоў з дня нараджэння **Каржанеўскага Іосіфа Іванавіча** (**31.03**.1806, г. Слуцк – 21.05.1870), вучонага ў галіне хірургіі і інфекцыйных хвароб, доктара медыцынскіх навук, прафесара, аўтара шматлікіх навуковых прац па пытаннях лячэння сыпнога тыфу, пераломаў, артапедыі.

## Красавік

**105** гадоў з дня нараджэння **Валынца Мікалая Іванавіча (3.04.**1921, в. Цялевічы – 1.03.2003), жывапісца, майстра пейзажа, аднаго з лепшых партрэтыстаў Беларусі, стваральніка галерэі партрэтаў Герояў Савецкага Саюза, вядомых дзеячаў культуры, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны.

**85** гадоў з дня нараджэння **Лесніковіча Анатоля Іванавіча** (**3.04**.1941, в. Рачкавічы – 05.02.2019), вучонага-фізікахіміка, акадэміка НАН Беларусі, вынаходніка СССР, заслужанага работніка адукацыі Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі (2012г.).

**125** гадоў з дня нараджэння **Філіповіча Арцёма Мікітавіча** (**6.04**.1901, в. Еўлічы – 28.12.1961), вучонага-інфекцыяніста, члена-карэспандэнта АМН СССР, доктара медыцынскіх навук, прафесара.

**70** гадоў з дня нараджэння **Варанцова Валерыя Леанідавіча** (**07.04.**1956, пас. Дзесятак Валагодскай вобл. (Расія)), заслужанага работніка фізічнай культуры і спорту Беларусі, лаўрэата рэспубліканскага конкурсу «Настаўнік года», выдатнік народнай адукацыі Рэспублікі Беларусь.Працаваў настаўнікам фізічнай культуры ў Замосцкай і Селішчанскай школах Слуцкага раёна. З 1980 г. працуе ў СШ № 10 г. Слуцка.

**105** гадоў з дня нараджэння **Гапановіча Віктара Якаўлевіча** (**15.04**.1921, в. Серадняκі – 2009), вучонага ў галіне отарыналарынгалогіі, доктара медыцынскіх навук, выдатніка аховы здароўя, педагога.

**80** гадоў з дня нараджэння **Кошаля Пятра Агеевіча** (**20.04**.1946, г. Слуцк), паэта, перакладчыка.

**105** гадоў з дня нараджэняя **Трухан (Тоўсцік) Таццяны Лукінічны** (**22.04**.1921, г. Слуцк), кандыдата педагагічных навук, аўтара звыш 40 навуковых прац.

**130** гадоў з дня нараджэння **Самусевіча Сцяпана Арцёмавіча** (**24.04**.1896, в. Вялікая Сліва – 23.12.1968), удзельніка Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў, савецка-фінляндскай вайны 1939–1940 гг., Вялікай Айчыннай вайны.

**Май**

**115** гадоў з дня нараджэння **Ліхадзіеўскага Сцяпана Іванавіча** (**9.05**.1911, в. Барок – 13.02.1979), паэта, перакладчыка, крытыка, літаратуразнаўца, доктара філалагічных навук.

**135** гадоў з дня нараджэння **Фядзюшына Анатоля Уладзіміравіча** (**11.05**.1891, г. Слуцк – 10.03.1972), вучонага ў галіне заалогіі і паразіталогіі, паляўніцтвазнаўства і аховы прыроды, заслужанага дзеяча навук Расіі, па праекце якога створаны Бярэзінскі біясферны

запаведнік, заснавальніка заагеаграфіі Беларусі, доктара біялагічных навук, прафесара.

**115** гадоў з дня нараджэння **Віткі Васіля (сапр. Крысько Цімох Васільевіч)** (**16.05**.1911, в. Еўлічы – 5.07.1996), паэта, празаіка, драматурга, крытыка, педагога, заслужанага дзеяча культуры Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1972).

**85** гадоў з дня нараджэння **Акуловіча Леаніда Міхайлавіча** (**19.05**.1941, в. Малоткова), вучонага ў галіне машынабудавання, вынаходніка СССР, доктара тэхнічных навук, лаўрэата прэміі Савета Міністраў Беларусі (1991), прэміі НАН Беларусі (2005).

**90** гадоў з дня нараджэння **Чарнаглазавай Раісы Андрэеўны** (**26.05**.1936, г. Слуцк – 4.06.2014), гісторыка-дакументаліста, даследчыка пытанняў гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны, аўтара і складальніка навуковых і навукова-папулярных кніг і альбомаў, адной з буйнейшых музеязнаўцаў Беларусі.

**280** гадоў з дня нараджэння **Лойка Антона** (**31.05**.1746, г. Слуцк – 1801), танцоўшчыка і балетмайстра, саліста прыдворнага тэатра Радзівілаў у Нясвіжы, педагога, аўтара шэрагу пастановак балетаў.

## Ліпень

**100** гадоў з дня нараджэння **Лазарука Міхаіла Арсеньевіча** (**5.07**.1926, в. Ушаловічы – 15.11.2000), літаратуразнаўца, педагога, крытыка, акадэміка НАН Беларусі і АПН СССР, доктара філалагічных навук (1970), прафесара (1971), замежнага члена Расійскай акадэміі адукацыі.

**75** гадоў з дня нараджэння **Дасаевай Таццяны Мікалаеўны** (**27.07**.1951, в. Старцавічы (цяпер – в. Знамя), крытыка, літаратуразнаўца.

**150** гадоў з дня нараджэння **Ярэміча Аляксанда Парфіравіча** (**31.07**.1876, г. Слуцк – 25.04.1920), вучонага ў галіне хірургіі, доктара медыцынскіх навук, аднаго з першаадкрывальнікаў унутрывеннага наркозу, ўдзельніка Беларускага таварыства па аказанні дапамогі пацярпелым ад вайны ў Петраградзе, культурна-грамадскага дзеяча.

## Жнівень

**140** гадоў з дня нараджэння **Гуткоўскага Мікалая Макаравіча** (**2.08**.1886, в. Забелы – 8.02.1938), юрыста і грамадскага дзеяча, навуковага супрацоўніка Інбелкульта, выкладчыка БДУ.

**125** гадоў з дня нараджэння **Уласаўца Аляксандра Ігнатавіча** (**8.08**.1901, в. Лапацічы – 23.01.1945), удзельніка партызанскага руху ў грамадзянскую вайну 1918-1920 гг., удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, Героя Савецкага Саюза.

**90** гадоў з дня нараджэння **Русак Валянціны Паўлаўны** (**08.08**.1936, Яраслаўская вобл. (Расія)), Заслужанага будаўніка Беларусі (1973), Ганаровага грамадзяніна Слуцкага раёна (2009). З 1958 г. прымала ўдзел у будаўніцтве цукроварафінаднага, сельскабудаўнічага камбінатаў, льнозавода, спартыўна-аздараўленчага комплексу «Дэльфін», жылля, дзіцячых садоў і іншых аб'ектаў у Слуцку.

**80** гадоў з дня нараджэння **Марціновіча Алеся (Аляксандра Андрэевіча)** (**18.08**.1946, в. Казловічы), літаратуразнаўца, крытыка, публіцыста, журналіста, краязнаўца, празаіка, заслужанага дзеяча культуры Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя К. Каліноўскага (1998г.), Нацыянальнай літаратурнай прэміі (2016), аўтара кнігі «Случчына. Старонка міла і багата» (2019).

**85** гадоў з дня нараджэння **Анатоля Васільевіча Клязовіча** (**27.08**.1941, в. Вялікая Сліва – 05.11.2000), мастака па інтэр'еры, жывапісца, афарміцеля інтэр'ераў краязнаўчых музеяў у Слуцку і Салігорску.

**80** гадоў з дня нараджэння **Башуры Андрэя Мікалаевіча** (**29.08**.1946, в. Гуляева), беларускага гаспадарчага дзеяча, кандыдата тэхнічных навук, поўнага кавалера знака «Шахцёрская слава», лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі, ганаровага грамадзяніна г. Салігорска.

## Верасень

**85** гадоў з дня нараджэння **Уладзіміра Барысавіча Кунтыша** (**02.09.**1941, в. Лапацічы), беларускага вучонага ў галіне цеплатэхнікі, доктара тэхнічных навук, член-карэспандэнта Міжнароднай энергетычнай акадэміі, акадэміка Міжнароднай акадэміі холаду.

**90** гадоў з дня нараджэння **Рубанава Аляксандра Сяргеевіча** (**12.09**.1936, г. Слуцк – 23.07.2003), вучонага-фізіка, акадэміка НАН Беларусі, заслужанага дзеяча навукі Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1976) і Дзяржаўнай прэміі СССР (1982).

**115** гадоў з дня нараджэння **Зайца Уладзіміра Іванавіча** (**22.09**.1911, в. Гацук – 5.07.1980), арганізатара і кіраўніка камуністычнага падполля і партызанскага руху ў Мінскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну.

## Кастрычнік

**130** гадоў з дня нараджэння **Гапановіча Дзмітрыя Апанасавіча** (**26.10**.1896, в. Танежыцы – 29.11.1952), генерал-лейтэнанта, удзельніка грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў.

**115** гадоў з дня нараджэння **Лобана Міколы (Мікалая Паўлавіча)** (**27.10**.1911, в. Чапліцы – 28.11.1984), пісьменніка, мовазнаўца, кандыдата філалагічных навук, заслужанага работніка

культуры Беларусі, лаўрэата Літаратурнай прэміі імя І.Мележа (1985).

## Лістапад

**95** гадоў з дня нараджэння **Людмілы Аляксееўны Ілюкевіч (10.11.**1931, в. Лучнікі), кандыдата хімічных навук, аўтара звыш 40 публікацый і навуковых артыкулаў.

**155** гадоў з дня нараджэння **Тэраўскага Уладзіміра Васільевіча** (**23.11**.1871, мяст. Раманава Слуцкага павета (цяпер аг. Леніна) – 10.11.1938), харавога дырыжора, кампазітара і фалькларыста, збіральніка беларускіх народных песень, стваральніка аднаго з першых беларускіх харавых калектываў (Мінск).

## Снежань

**80** гадоў з дня нараджэння **Кабушкіна Мікалая Іванавіча** (**13.12**.1946, в. Сярагі), вучонага-эканаміста, педагога, доктара эканамічных навук, заслужанага работніка адукацыі Беларусі.

**85** гадоў з дня нараджэння **Дубінкі Вячаслава Андрэевіча** (**17.12**.1941, г. Слуцк – 10.08.2010), пісьменніка, аўтара краязнаўчых фотанарысаў, дзеяча народнага мастацтва («выцінанка»).

**125** гадоў з дня нараджэння **Астапені Паўла Васільевіча** (**27.12**.1901, в. Маглышы – 13.11.1981), вучонага-гігіеніста, доктара медыцынскіх навук, заслужанага дзеяча навукі Беларусі.

# Памятныя даты календара, 2026.

# г.Слуцк, Слуцкі раён

**Складальнік: С. І. Сарагавец**

**Рэдактар: Л. В. Гурыновіч**

**Камп’ютэрны набор: С. І. Сарагавец**

**223610 г.Слуцк,
вул.Капыльская, 2а
Дзяржаўная ўстанова
«Слуцкая раённая
цэнтральная бібліятэка»
e-mail: info@slucklib.by**